# На тым тыдні...

✓ **27 лютага** Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь сумесна з Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам імя А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае» правялі ўрачыстае **адкрыццё фотавыставы «Міхайлаўскае. Кабінет Пушкіна»**. Пушкінскі запаведнік – унікальны помнік рускай культуры нацыянальнага і сусветнага значэння. Міхайлаўскае, Трыгорскае, Пятроўскае, невялікі пасёлак Святыя (цяпер Пушкінскія) Горы са старадаўнім Святагорскім манастыром – гэтыя мясціны непарыўна звязаныя з жыццём і творчасцю вялікага рускага паэта. Запаведныя месцы на Пскоўшчыне прыцягваюць да сябе пісьменнікаў, мастакоў і артыстаў. Свой погляд на Міхайлаўскае прадстаўляюць фотамастакі Аляксей Лазараў і Мікалай Аляксееў.

✓Музей «Лошыцкая сядзіба» **28 лютага** запрасіў на **адкрыццё выставы «Нальшанскія сустрэчы»**, што стала вынікам леташняга мастацка-літаратурнага пленэра па жывапісных мясцінах ракі Віліі. Гэта расповед мастакоў, якія мінулым летам сабраліся каля старога млына на аграсядзібе «Вялес» на стромкіх берагах Віліі. Да мастакоў далучыліся беларускія паэты і барды. Нагадаем, што пленэр адбыўся пры падтрымцы дабрачыннага фонду «Спадчына М.К. Агінскага» і аматараў культуры Франца Жылкі і Алега Мізулы. Сярод аўтараў, чые творы дэманструюцца, заслужаныя дзеячы мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктар Барабанцаў і Віктар Нямцоў, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Алесь Суша і вядомыя мастакі мінскага краю Анатоль Бяляўскі, Віктар Мікіта, Галіна Бяганская, Кастусь Качан, Таццяна Ласка і Эдуард Мацюшонак.

Выстава ўяўляе сабой мастацкае падарожжа па Віліі, перад вачыма паўстаюць жывапісныя краявіды і квітнеючыя сады, старажытныя млыны і бровары, капліца Святога Францішка ды іншыя прыцягальныя мясціны.



14 і 28 сакавіка на «Нальшанскіх сустрэчах» у Лошыцкай сядзібе адбудуцца літаратурныя сустрэчы з паэткамі Алай Клемянок і Антанінай Хатэнка.

Павандраваць з дапамогаю мастакоў па Нальшчанскім краі можна па 29 сакавіка.

✓ **3 сакавіка** мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» запрасіла на **адкрыццё Трэцяй выставы керамікі «Між рукамі і полымем: КераМІФічнае»**, ініцыяванай ГА «Гільдыя керамістаў».

Праект «Між рукамі і полымем» створаны дзеля папулярызацыі мастацтва керамікі і садзейнічання развіццю майстроў, якія працуюць у гэтай галіне дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Прадстаўленыя працы 20-і беларускіх і расійскіх аўтараў. Асаблівасцю праекта з'яўляецца тое, што можна пабачыць творы керамістаў рознага ўзроўню – ад пачаткоўцаў да знакамітых мэтраў.



*«Між рукамі і полымем: КераМІФічнае»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ